Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-05-24

# На тым тыдні...

✓ **16 мая** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбыўся вечар **«Шлях да Быкава».** Лёс Васіля Быкава быў апалены вайной, пра якую ён з магутнай сілай змог сказаць праўду, раскрыць яе антычалавечую сутнасць. Для пісьменніка вайна сталася мерай чалавечай годнасці.

Перад пачаткам мерапрыемства ў прысутных была магчымасць пазнаёміцца з выстаўкай «Васіль Быкаў. Шлях вызначаны лёсам» і паглядзець дакументальны фільм рэжысёра Сяргея Ісакава «Я раскажу вам пра вайну».

✓ **17 мая** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **прэзентацыя факсімільнага выдання (у двух кнігах) Выдавецтва Беларускага Экзархата – «Житие блаженной Евфросинии, игумени монастыря Вседержителя Святого Спаса во граде Полоцке»** (спіс сярэдзіны XVI ст.), **прымеркаванае да 1150-годдзя Полацка.**

У межах мерапрыемства ў бібліятэцы арганізаваная выстаўка «Славен град Полоцк», дзе прадстаўленыя выданні 1582–2010 гг., прысвечаныя гісторыі і культуры Полацка. Таксама былі прадэманстраваныя выданні XVIII–XIX стст., што выйшлі з друкарні Полацкага езуіцкага калегіума на польскай і лацінскай мовах. Сярод іх – «Miesiecznik Polocki» («Полацкі месячнік») – першы часопіс на тэрыторыі дарэвалюцыйнай Беларусі. Экспазіцыя ўключае таксама і сучасныя выданні, прысвечаныя Полацку. З экспанатамі выстаўкі можна пазнаёміцца ў чытальнай зале аддзела рэдкіх кніг і старадрукаў да канца чэрвеня.

✓ **19 мая** Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы ў межах міжнароднай акцыі «Ноч музеяў» запрасіў усіх ахвочых паўдзельнічаць у новым праекце **«Паўлінка-NEXT».** Сёлета спаўняецца 130 гадоў з дня нараджэння паэта і 100 гадоў з часу напісання яго знакамітай п’есы «Паўлінка». Святочная ноч ажывіла купалаўскіх персанажаў, сабрала безліч Паўлінак, зачаравала мілагучнымі спевамі. Таксама адбылося адкрыццё выстаўкі «Неўміручая Паўлінка», майстар-клас па старадаўніх беларускіх народных танцах, чытанне вершаў Купалы і інсцэніроўка ўрыўка з п’есы «Паўлінка», кірмаш рамёстваў, майстар-клас па пляценні косаў і конкурс на самую прыгожую касу, майстар-клас па валянні сувеніраў. Прайшла канцэртная праграма маладых выканаўцаў, гуртоў «Alta Mente», «Нельга забыць», «Varadeno», школы этнічных барабанаў «TekaDum» і інш.

✓ Сёлета ў святочнай **«Ночы музеяў»** прынялі ўдзел розныя музеі краіны, прапанаваўшы разгорнутыя праграмы, што складаліся не толькі з прагляду экспазіцыяў, але і з забаўляльных мерапрыемстваў: канцэртаў, майстар-класаў, конкурсаў і інш.

*Падрабязней пра «Ноч музеяў» чытайце ў сённяшнім (стар. 5) і наступным нумарах.*

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні…